# ЭТНАГРАФІЧНАЯ СПАДЧЫНА ЭТНІЧНЫХ СУПОЛЬНАСЦЕЙ У МУЗЕЙНАЙ ПРАСТОРЫ

**І. М. Сімакова,**
*аспірант кафедры этналогіі,*
*музеялогіі і гісторыі мастацтваў*
*гістарычнага факультэта*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*

Роля этнаграфічнай спадчыны як важнага фактару захавання культурнай самабытнасці народаў незалежна ад іх палітычнай і сацыяльнай арганізацыі, узроўню эканамічнага развіцця неаднаразова падкрэслівалася даследчыкамі. Плённая дзейнасць па захаванні культурнай разнастайнасці вядзецца этнаграфічнымі музеямі.

У станаўленні і развіцці этнаграфічных музеяў свету прасочваюцца дзве тэндэнцыі. Першая – захаванне нацыянальнай спадчыны ў межах сваёй дзяржавы, другая – цікавасць да культуры іншых народаў. Дадзены артыкул прысвечаны музеям, якія збіраюць, вывучаюць і папулярызуюць матэрыяльную і духоўную спадчыну розных этнічных груп.

Усплёск збіральніцтва экзатычных рэчаў назіраўся ў часы Вялікіх геаграфічных адкрыццяў, калі ў прыватных зборах апынуліся этнаграфічныя матэрыялы нееўрапейскіх народаў. Некаторыя з такіх незвычайных прадметаў у XVIII ст. апынуліся і на тэрыторыі Беларусі дзякуючы еўрапейскім сувязям беларускіх асветнікаў. Напрыклад, у прыватным зборы Ганны Ябланоўскай у Семяцічах размяшчаліся такія экзатычныя прадметы, як народныя строі жыхароў Індыі [2, с. 24].

Асаблівая ўвага набыццю і вывучэнню прадметаў матэрыяльнай культуры «нецывілізаваных» народаў надавалася ў перыяд фарміравання каланіяльных дзяржаў. Тады ж узніклі публічныя этнаграфічныя музеі ў сучасным іх разуменні. Першым з іх стаў Этнаграфічны аддзел Нацыянальнага музея Даніі, адкрыты ў 1849 г. [2, с. 32]. Затым такога кшталту музеі адчынілі свае дзверы для наведвальнікаў у іншых краінах Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

Адзін са старэйшых этнаграфічных музеяў на Амерыканскім кантыненце быў заснаваны пры Гарвардскім універсітэце ў 1866 г. для вывучэння і экспанавання прадметаў дакалумбавай Амерыкі і Акіяніі. У 1886 г. быў адкрыты Берлінскі музей народазнаўства. На

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

базе міжнароднай выставы ў Тэрвюрэне (Бельгія) у 1898 г. створаны музей Конга. У 1910 г. у Нідэрландах заснаваны Каралеўскі інстытут тропікаў і музей пры ім. Пасля каланіяльнай выставы ў Парыжы ў 1931 г. адкрыты Французскі музей калоній [3, с. 13].

Экспазіцыі першых каланіяльных этнаграфічных музеяў у другой палове XIX ст. будаваліся згодна з тэорыяй эвалюцыянізму, якая абумовіла фарміраванне культурнай іерархіі, дзе дамінуючыя пазіцыі займалі «цывілізаваныя» еўрапейскія народы, а падначаленая роля адводзілася культурам «нецывілізаваным». Вывучэнне побыту каланіяльных народаў з'яўлялася грунтоўнай падставай для больш эфектыўнага кіравання імі. Таму этнаграфічныя музеі былі адкрытымі для шырокай аўдыторыі і арыентаваліся пераважна на моладзь з мэтай выхавання новага пакалення для паспяховай працы ў калоніях. З аднаго боку, экзатычныя выставы і прадстаўленыя на іх незразумелыя для мясцовай аўдыторыі прадметы абуджалі цікавасць і задавальнялі попыт у чымсьці незвычайным, а з другога – з'яўляліся наглядньімі справаздачамі аб дзейнасці метраполіі ў калоніях.

Такой канцэпцыі адпавядала і экспазіцыя Расійскага этнаграфічнага музея, заснаванага ў 1902 г. у якасці аддзела Рускага музея і прызначанага адлюстраваць дамінуючае становішча рускіх на ўсіх абшарах Расійскай імперыі. Калекцыі па этнаграфіі беларусаў, якія збіраліся статыстычнымі камітэтамі, Рускім геаграфічным таварыствам і іншымі ўстановамі, павінны былі наглядна дэманстраваць «рускае» паходжанне дадзенага народа. У савецкі час новая ідэалогія патрабавала ліквідацыі ўсяго этнічнага ў экспазіцыях, таму хутка творы народнай культуры замяніліся прадметамі прамысловай вытворчасці, пазбаўленымі ўнікальнасці і самабытнасці.

Пасля Другой сусветнай вайны працэсы дэкаланізацыі прынеслі змены ў канцэпцыі этнаграфічных музеяў Еўропы. Значная частка іх была пераарыентавана на дэманстрацыю не этнічнага, а эстэтычнага боку музейных прадметаў. Так, Французскі музей калоній быў рэарганізаваны ў Нацыянальны музей мастацтва Афрыкі і Акіяніі.

Місія новага этнаграфічнага музея была сфармулявана яшчэ пры стварэнні Музея чалавека ў 1937 г. знакамітым французскім антрапалагам, этнолагам і лінгвістам Полем Рыве. Экспазіцыя прадугледжвала дэманстрацыю чалавецтва ў яго адзінстве і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

markup
рознабаковасці, сацыяльную, біялагічную і культурную прыроду людзей без паказу дамінавання аднаго народа над другім. Адпаведна дадзенай канцэпцыі ў другой палове XX ст. этнаграфічныя музеі заходнееўрапейскіх краін з’яўляліся не толькі навуковымі і адукацыйна-выхаваўчымі ўстановамі. Яны сталі сапраўднымі культурнымі цэнтрамі этнічных груп, абшчын імігрантаў. Таму іх дзейнасць на парозе XXI ст. пераарыентавалася на вырашэнне сучасных сацыяльных праблем.

На тэрыторыі Беларусі адкрыццё этнаграфічных музеяў у другой палове XX ст. было звязана з развіццём уласна этнаграфічнай навукі. Сістэматычнае і планавае вывучэнне матэрыяльнай культуры беларусаў этнолагамі станоўча адбівалася на музейнай практыцы. Музейныя супрацоўнікі самастойна або з дапамогай пазамузейных спецыялістаў ажыццяўлялі этнаграфічныя экспедыцыі для папаўнення фондавых калекцый. У першую чаргу ўвага ў галіне камплектавання надавалася прадметам, што адлюстроўвалі этнічныя асаблівасці беларусаў. Такая тэндэнцыя абсалютна зразумелая і мае падставы. Музеёлагі, як і навукоўцы акадэмічных устаноў, імкнуліся да захавання нацыянальнай спадчыны, уласных традыцый, самабытных рысаў – таго пласта культуры, які ў савецкім грамадстве доўгі час ігнараваўся. Таму этнаграфічная спадчына этнічных груп, што стагоддзямі пражывалі на тэрыторыі Беларусі, заставалася па-за ўвагай музейных практыкаў.

У сучасны момант у краіне, акрамя профільных этнаграфічных, практычна ўсе краязнаўчыя музеі ўтрымліваюць этнаграфічныя калекцыі, якія адлюстроўваюць сацыяльную культуру беларускай этнічнай супольнасці. І толькі на сучасным этапе развіцця музейнай справы ў Беларусі музейныя ўстановы далучаюцца да сусветнага вопыту па вывучэнні і папулярызацыі культуры розных этнічных груп.

Унутрымузейная дакументацыя сведчыць, што пераасэнсаванне значнасці захавання культурнай разнастайнасці адбываецца на канцэптуальным узроўні. Так, у Канцэпцыі камплектавання фондаў Горацкага гісторыка-этнаграфічнага музея адзначаецца неабходнасць набыцця прадметаў, якія адлюстроўваюць культуру мясцовага яўрэйскага насельніцтва [4]. У экспазіцыі дадзеныя матэрыялы пакуль не прадстаўлены, але пачатак збіральніцкай дзейнасці пакладзены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У экспазіцыйнай прасторы Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігій паказаны асобныя аспекты культуры этнічных супольнасцей краіны. Дзве залы прысвечаны рэлігіі беларускіх татараў і яўрэяў. Экспазіцыя зарыентавана пераважна на раскрыццё інфармацыйнага патэнцыялу культавых прадметаў, аднак яна не пазбаўлена этнаграфічных матэрыялаў, якія характарызуюць матэрыяльную культуру дадзеных этнічных груп.

Асобны экспазіцыйны комплекс Магілёўскага музея этнаграфіі прысвечаны яўрэям. Тут дэманструецца яўрэйская крама як частка гарадской прасторы, а яўрэйскае насельніцтва выступае, гэткім чынам, у якасці асобнай этнічнай групы губернскага горада са сваёй асаблівай сацыяльнай арганізацыяй, заняткамі, рэлігіяй і г.д.

Найбольш поўна канцэпцыя этнаграфічнага музея як месца культурнага ўзаемаўзбагачэння розных народаў была рэалізавана ў Іўеўскім музеі нацыянальных культур. Ідэя яго стварэння ўзнікла яшчэ ў 1980-х гг., аднак па арганізацыйных і фінансавых прычынах на той момант музей не быў адкрыты. З улікам этнічнай спецыфікі рэгіёну, дзе кампактна пражывае і сёння татарская абшчына, у 2002 г. навукова-метадычная рада Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея прыйшла да высновы аб неабходнасці арганізацыі ў Іўі музея, прысвечанага татарскай культуры. Аднак праект не быў ухвалены, як і пазнейшая ініцыятыва аб стварэнні ў горадзе этнаграфічнага музея-скансэна. І толькі ў 2003 г. пытанне аб музейным будаўніцтве было вырашана станоўча. Аднак работы па падрыхтоўцы дакументацыі і рэканструкцыі будынка ішлі даволі марудна. Таму адкрыццё ўстановы адбылося толькі ў ліпені 2009 г. Тэматычная накіраванасць музея абгрунтавана неабходнасцю захавання культурных адметнасцей розных этнічных груп рэгіёна.

Фонд пачаў фарміравацца незадоўга да адкрыцця музея. Сярод першых набытых прадметаў – Талмуд і кнігі на ідыш, прадметы побыту і фотаздымкі пачатку XX ст. і ваенны рыштунак перыяду Другой сусветнай вайны. На канец 2010 г. у музеі налічвалася 382 прадметы асноўнага фонду і 349 навукова-дапаможнага. Усяго вылучана чатырнаццаць калекцый.

Тэматыка-экспазіцыйны план будучай стацыянарнай экспазіцыі прадугледжвае раскрыццё чатырох асноўных тэм: «Гісторыя карэннага насельніцтва Іўеўшчыны» (беларусы і палякі), «Беларускія татары», «Беларускія яўрэі», «Другая сусветная вайна» [5]. Першыя тры раздзелы экспазіцыі павінны адлюстроўваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры розных этнічных супольнасцей рэгіёна. Таму музей вядзе актыўную пошукавую дзейнасць па выяўленні прадметаў культу, побыту, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, адзення з характэрнымі этнічнымі рысамі. Такі падыход цалкам адпавядае місіі музея. Аднак адлюстраванне ваеннай тэмы ў дадзенай установе па традыцыйнай схеме (перадумовы вайны – абарончыя баі – акупацыйны рэжым – вызваленне) выходзіць за межы агульнай канцэпцыі і набліжае экспазіцыю да нагляднага дапаможніка. Значна больш адпавядае задачам музея дэманстрацыя трагічных падзей праз прызму ўспрымання іх кожнай з этнічных груп.

Праца па падрыхтоўцы экспазіцыі працягваецца. Сёння ўжо адкрыты выставы «Рэлігія і лад жыцця беларускіх яўрэяў» і «Беларускія татары – скрозь стагоддзі ў будучыню».

Супрацоўнікам этнаграфічных музеяў сёння неабходна займацца не толькі непасрэдна дзейнасцю па камплектаванні фондаў і іх вывучэнні, але і наладжваць навуковыя і метадычныя кантакты з калегамі з замежных устаноў. Асабліва гэтае пытанне актуальна для музея такой тэматычнай накіраванасці, як Іўеўскі музей нацыянальных культур. Ён актыўна супрацоўнічае з замежнымі ўстановамі культуры, а таксама з грамадскімі аб’яднаннямі этнічных супольнасцей, якія дзейнічаюць на тэрыторыі краіны. Падтрымка такіх сувязей адкрывае перспектывы для больш якаснага камплектавання фондаў і стварае ўмовы для выканання місіі музея як установы, накіраванай на падтрымку і развіццё культуры этнічных груп, фарміраванне іх этнічнай свядомасці. Музей узаемадзейнічае з Мусульманскім рэлігійным аб’яднаннем Беларусі, Беларускім грамадскім аб’яднаннем татар «Зікр уль-Кітаб», Фондам захавання і развіцця творчай спадчыны паэта Г. Тукая (Казань), міжнародным грамадскім аб’яднаннем «Татара-башкірская культурная спадчына “Чышма”», міжнародным праектам «Карані» (Ізраіль) і інш.

Такім чынам, шэраг этнаграфічных музеяў узнік у якасці каланіяльных з мэтай дэманстрацыі перавагі еўрапейскіх народаў над іншымі. Аднак у другой палове XX ст. яны былі пераарыентаваны на вырашэнне актуальных сацыяльных праблем, падтрымку абшчын імігрантаў, выхаванне самасвядомасці этнічных груп. На тэрыторыі Беларусі сёння таксама ёсць асобныя экспазіцыі і нават музеі, прысвечаныя этнічным супольнасцям краіны. Іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галоўная мэта – захаванне культурнай разнастайнасці і ўзаемаўзбагачэнне культур.

---


*1. Говард, М.* Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард; пер. з англ. І. Карпікава, М. Раманоўскага, А. Шыманскага; пад. рэд. П. Церашковіча. – Мінск: Тэхналогія: Беларускі Фонд Сораса, 1995. – 478 с.

*2. Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2001. – С. 124.

*3. Клебер-Шварц, Л.* От музея колоний – к музею общин / Л. Клебер-Шварц // Museum. – 1993. – № 1 (175). – С. 13–17.

*4. Навуковая* канцэпцыя камплектавання фондаў Горацкага гісторыка-этнаграфічнага музея // Навуковы архіў Горацкага гісторыка-этнаграфічнага музея.

*5. Навуковая* канцэпцыя развіцця Іўеўскага музея нацыянальных культур // Навуковы архіў Іўеўскага музея нацыянальных культур.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ